Падтрымай "Вясну" на PATREON

Ізноў суды: У Берасці судзілі Паўла Кінчака, у Віцебску - Баразну

дапоўнена

19.05.2020 **Тэгі**: адміністратыўны пераслед, свабода мірных сходаў



Павел Кінчак.

У Беларусі дагэтуль працягваюцца суды над удзельнікамі сустрэч з блогерам Сяргеем Ціханоўскім ці акцый па “кармленні галубоў”: многіх удзеньнікаў чакаюць новыя адміністрацыйныя справы і пратаколы.

Брэст

Суд Ленінскага раёна Берасця 19 траўня разгледзеў адміністрацыйную справу **Паўла Кінчака.**

Берасцейскі дальнабойнік Павел Кінчак быў затрыманы на мяжы, пры перасячэнні польска-беларускай мяжы. Як паведамляла “Брэсцкая газета”, днём 16 траўня Павел вяртаўся з грузам з Польшчы ў Беларусь. Яго затрымалі адразу пасля пераходу мяжы.

Кінчака абвінавачваюць ва удзеле у несанкцыянаванай акцыі пратэсту супраць акумулятарнага завода, якая праходзіла ў Брэсце 12 красавіка. Да суда яго змясцілі ў ізалятар.

Справу разглядае суддзя А. Семянчук. Ён забараніў весці фота і відэаздымку ў судовай залі.

Кінчак кажа, што 12 красавіка ішоў па вуліцы, шпацыраваў, было цікава. Людзі ішлі, ён з імі не быў знаёмы. Ніякіх лозунгаў не прамаўляў. Прызнае, што браў удзел у шэсці.

Сведка **Піліп Пятленка**, супрацоўнік АБЭП, нёс службу і бачыў, што Кінчак прымаў удзел і даваў блогеру Ціханоўскаму інтэрв'ю. Прысутныя выкрыквалі лозунгі падчас шэсця.

Адвакат прасіў далучыць да матэрыялаў справы копію дакумента аб тым, што на ўтрыманні Кінчака непаўнагадовае дзіця.

Пастанова: парушыў ч.1 арт 23.34 КаАП, штраф у памеры 30 базавых велічынь.

Таксама на сёння быў прызначаны суд над праваабаронцам **Раманам Кісляком**. Аднак, як паведаміў сябра ПЦ "Вясна" **Уладзімір Вялічкін**, суд адкладзены на нявызначаны тэрмін па прычыне хваробы Рамана Кісляка.

Першапачаткова судовае паседжанне пачалося 14 траўня. Разгляд адміністрацыйнай справы ў дачыненні да Кісляка ішоў адразу па двух пратаколах — за шэсьці 12 красавіка і 3 траўня (частка 1 артыкула 23.34 КаАП). На судовым паседжанні Кісляк заявіў хадайніцтва для таго, каб апратэставаць напісанае ў пратаколе. Так, РАУС у пратаколе ўказаў, што Раман падчас акцыі ішоў у калоне пратэстоўцаў.

Раман Кісляк падчас судовага паседжання запатрабаваў далучыць да матэрыялаў справы відэазапісы, якія пацвярджаюць, што ён быў на гэтых сходах у якасці менавіта назіральніка. Суд вырашыў зрабіць перапынак да 19 траўня, каб ён мог прадаставіць гэта відэа.

Віцебск

Суд Чыгуначнага раёну Віцебска 19 траўня пакараў віцябляніна **Алега Баразну** штрафам у памеры 30 базавых велічынь за ўдзел у стрыме блогера Сяргея Ціханоўскага. Суддзя палічыла, што Баразна, адказаўшы на пытанне блогера, паўдзельнічаў у несанкцыянаваным пікетаванні і парушыў тым самым заканадаўства аб масавых мерапрыемствах (ч.1 арт. 23.34).

Адміністрацыйную справу Алега Баразны разглядала суддзя **Святлана Варатынская**. Па інфармацыі “Віцебскай Вясны”, паводле міліцэйскага пратаколу, Алег Баразна 30 красавіка ўзяў удзел у несанкцыянаваным пікетаванні, на якім абмяркоўвалася сацыяльная палітыка дзяржавы, будучыя выбары, выказвалася незадавальненне кіраўніцтвам дзяржавы.

Абвінавачаны мужчына з пратаколам не пагадзіўся. Заявіў, што трапіў на сустрэчу выпадкова і быў упэўнены, што анічога супрацьзаконнага ня чыніць.

Суддзя Святлана Варатынская палічыла вінаватасць Баразны даказанай (сведкі ў суд не выклікаліся) і пакарала яго за парушэнне заканадаўства аб масавых мерапрыемствах штрафам у памеры 30 базавых велічынь (810 рублёў).



Алег Баразна. Фота: "Віцебская Вясна".

Гэта ўжо другі штраф, прысуджаны Баразне ў траўні 2020 году за правапарушэнні паводле арт. 23.34. Раней, 8 траўня, суддзя Алена Цыганкова аштрафавала яго на 540 рублёў за ўдзел у акцыі кармлення галубоў. Суткі да таго суду Алег Баразна правёў у ізалятары часовага ўтрымання.

Твитнуть



СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ

Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску


"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



Палітзняволеную Вікторыю Кульшу ў зарэчанскай калоніі збіваў і душыў наглядчык

"У мяне ў першы ж дзень на ЦІПе здарыўся прыступ асфіксіі", — былая арыштантка Акрэсціна

"Мы прыдумлялі розныя махінацыі, каб папросту выжыць", — экс-зняволены пра жыццё і працу ў шклоўскай калоніі

"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў







АПОШНІЯ НАВІНЫ

У калоніі памёр палітвязень Мікалай Клімовіч. Яго асудзілі да зняволення, негледзячы на захворванне сэрца

Мастака Генадзя Драздова асудзілі да трох гадоў калоніі

Падазраюць у здрадзе дзяржаве і здзяйсненні акту тэрарызму: хроніка пераследу 10-11 траўня

Адвакатку Анастасію Лазарэнку асудзілі да 6 гадоў калоніі

Гімн Украіны ў караоке, БЧБ-чахол, пікетаванне ў тралейбусе: за што беларусаў судзілі ў красавіку

Затрыманні настаўнікаў, супрацоўнікаў радыё, фатографа: хроніка пераследу 4-9 траўня

У Гомелі пачнуць судзіць журналіста-фрылансера і краязнаўцу Яўгена Меркіса

У Брэсце асудзілі айцішніка за абразу Аляксандра Лукашэнкі

21 траўня — Дзень палітвязняў у Беларусі. Далучайся да акцый салідарнасці!


МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Красавік 2023

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022







ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская Інтэрнэт-Бібліятэка

ВЫТОКІ

ADC memorial
Anti-Discrimination Centre

Московская Хельсинкская группа

AMNESTY INTERNATIONAL

СЯБРОЎСТВА

EENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

МІЖНАРОДНЫ КАМІТЭТ ПА РАССЛЕДАВАННІ КАТАВАННЯЎ У БЕЛАРУСІ

Беларуская асацыяцыя журналістаў
baj.by

VOICE OF BELARUS

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY